ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 5 (25) Субота 17 лютага 1945 г.

## Больш лесаматэрыялаў краіне і фронту!

### Кожны лесаруб, кожны лесавозчык павінен працаваць не пакладаючы рук і датэрмінова выканаць свой абавязак перад Радзімай

## ВЫШЭЙ ВЫТВОРЧАСЦЬ ПРАЦЫ НА НАРЫХТОЎЦЫ І ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ

Прайшло ўжо больш паловы квартала. Аднак выкананне плана нарыхтоўкі і вывазкі лесаматэрыялаў у раёне не дасягнула і 50 проц. Пры наяўнасці добрай зімовай дарогі такое адставанне з'яўляецца нецярпімым.

У чым прычына адставання?

Перш за ўсё ў нізкай вытворчасці працы лесарубаў і возчыкаў. Не гледзячы на тое, што ў лес кожны дзень выязджае дастатковая колькасць фурманак, дырэктары леспрамгасаў т. т. Манахаў і Алтухоў і начальнікі лесаўчасткаў не дабіліся правільнай арганізацыі працы, не змагаюцца за павышэнне прадукцыйнасці працы.

Блізасць лесасек ад скадаў дазваляе рабіць 2 рэйсы у дзень, ці ў крайнім выпадку тры рэйсы ў 2 дні. Для гэтага неабходна тэрмінова арганізаваць стаянкі для возчыкаў у бліздяжачых ад лесасек вёсках. Барацьба з пустым, непатрэбным прабегам коней у 20-30 кілометраў павінна стаяць на павестцы дня кіраўнікоў леспрамгасаў. Гэта ў значнай меры забяспечыць павышэнне нагрузкі на кожнага каня, павысіць прадукцыйнасць працы лесарубаў.

Работнікам леспрамгасаў трэба звярнуць асабліва сур'ёзную ўвагу на стымуліраванне лепшых лесарубаў і возчыкаў, на папулярызацыю лепшых метадаў працы. Арганізацыя соцспаборніцтва на лесанарыхтоўках і вывазках з'явіцца важным фактарам у справе максімальнага павышэння вытворчасці працы.

Трэба раз і назаўсёды ліквідаваць непаваротлівасць апаратаў кантор леспрамгасаў і лесаўчасткаў, наладзіць правільны і своечасовы ўлік зробленага кожным рабочым, своечасова разлічвацца з лесарубамі і возчыкамі.

Краіна і фронт патрабуюць больш лесаматэрыялаў. Барацьба за хутчэйшае выкананне плана лесанарыхтовак і лесавывазак — гэта барацьба за хутчэйшы і канчатковы разгром ворага. Абавязак кіраўнікоў леспрамгасаў, партыйных і совецкіх арганізацый мабілізаваць усе сілы на датэрміновае выкананне плана першага квартала.

## ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ

Нарыхтоўка і вывазка лесаматэрыялаў — важнейшае мерапрыемства, якому надаём мы важнейшае значэнне. Выкананне ў тэрмін даведзеных планаў — пачотны абавязак кожнага лесаруба, кожнага возчыка.

У Косаўскім лесаўчастку працуе многа выдатных лесарубаў і возчыкаў. Разумеючы важнасць нарыхтоўкі і вывазкі лесу, яны не толькі выконваюць, але і перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Лесарубы першай брыгады, жыхары в. Рацкевічы Бусяжскага сельсовета Дзянісік Ігнат, Бялевіч Гіляр, Калеснік Рыгор, Гардзейка Раман і Попка Іван штодзённа выконваюць нормы выпрацоўкі на 160 процантаў.

Добра працуюць лесарубы Харунжы Павел і Харунжы Сцяпан (в. Хадоркі Грыўдзенскага сельсовета). Дзённыя нормы яны выконваюць на 140 проц.

Не пакладаючы рук працуюць у лесе возчыкі Бульскі Канстанцін (в. Руда Сенькавіцкага сельсовета) і Гардзейка Іосіф (в. Лазаўцы Бусяжскага сельсовета), Бульскі выконвае дзённыя нормы на 150 проц., а Гардзейка на 130 проц. Яны служаць прыкладам для ўсіх возчыкаў.

Аднак ёсць людзі, якія не хочуць разумець задач пастаўленых перад імі радзімай. Да такіх адносяцца лесарубы Валах Пятро і Валах Сямён з вёскі Белавічы. На рабоце яны лодарнічаюць і дзённую норму выпрацоўкі выконваюць менш чым на 50 проц.

Для таго, каб датэрмінова выканаць квартальны план нарыхтоўкі і вывазкі лесу трэба ўсім працаваць так, як лесарубы першай брыгады, як возчыкі Бульскі і Гардзейка.

А. САЎЧУК.

## Дабіцца масавасці на нарыхтоўцы і вывазцы лесу

Нашаму раёну прысуджан пераходны Чырвоны Сцяг абкома КП(б) Беларусі і Выканкома облсовета дэпутатаў працоўных за перавыкананне плана лесанарыхтоўкі і лесавывазкі ў 4 квартале 1944 года.

У гэтым квартале мы маем яшчэ большыя магчымасці для яшчэ хутчэйшага выканання і перавыканання плана першага квартала. Добрая зімовая дарога, блізасць лесасек ад лесаскладаў дае магчымасць у значнай меры павялічыць нагрузку на кожнага каня.

Нам патрэбна дабіцца масавага выхаду і выезду ў лес. Асабліва гэта датычыць старшынь Белавіцкага, Альшаніцкага і Любішчыцкага сельсоветаў, дзе ўсё яшчэ спадзяюцца на ўпаўнаважаных з раёна і такое важнейшае мерапрыемства як нарыхтоўка і вывазка лесу пусцілі на самацёк.

Прыкладзем усе сілы, каб пераходны Чырвоны Сцяг абкома і облвыканкома і надалей астаўся ў нашым раёне.

А. КАЛІНА.

# МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Паступаючыя з Германіі звесткі гавораць аб тым, што паражэнні нямецкіх войск на совецка-германскім фронце прывялі да катастрафічных вынікаў і ўнутры краіны. У Германіі ўзмацняецца паніка і разруха. Прыведзен у разбурэнне транспарт. Мільёны жыхараў бягуць з усходніх абласцей. Яны перапоўнілі многія гарады. Насельніцтва Берліна атрымала загад аб эвакуацыі. З харчаваннем справа абстаіць так дрэнна, што ўлады не могуць забяспечыць бежанцаў. Абвешчана аб скарачэнні пайка для ўсяго насельніцтва.

Як паведамляюць знаходзячыяся ў Берліне карэспандэнты нейтральных краін, туды з патокам бежанцаў прыбывае з усхода вялікая колькасць дызертыраў. Гэты факт падцвярджаецца і загадамі ваенных улад, якія забараняюць насельніцтву пад пагрозай найстражэйшых пакаранняў прадстаўляць прытулак ваеннаслужачым, «адстаўшым ад сваіх часцей».

Амерыканскія карэспандэнты адзначаюць, што наступленне Чырвонай Арміі прывяло да падзення духу гітлераўскіх салдат і на заходнім фронце. Нямецкая абарона тут робіцца больш слабай у выніку перабраскі значнай часткі войск на ўсход. Павялічваецца лік варожых салдат і афіцэраў, якія здаюцца ў палон.

Перадольваючы ўпорнае супраціўленне ворага, воіны Чырвонай Арміі прадаўжаюць прасоўвацца ўперад. Да Берліна ўжо засталося не больш 70 кіламетраў. У той жа час саюзная авіяцыя на гэтым тыдні двойчы падвергла германскую сталіцу моцнай бамбардыроўцы. Нанесены пашкоджанні вакзалам, сартыровачнай станцыі і цэнтральным кварталам. Некалькі бомб трапіла ў будынак германскага міністэрства авіяцыі.

На заходнім фронце саюзнымі войскамі заняты горад Кольмар у Эльзасе. Павольна прасоўваючыся ўперад, саюзнікі ўступілі на радзе ўчасткаў у межы Германіі.

* * *

Войскі Чырвонай Арміі амаль поўнасцю вызвалілі тэрыторыю Польшы. Польскі народ на сваіх мітынгах і сходах выказвае бязмежную ўдзячнасць слаўным совецкім воінам за вызваленне краіны ад нямецкіх захопнікаў.

Польскі Часовы ўрад пераехаў ужо ў Варшаву, сталіцу Польшы.

* * *

З Сафіі паведамляюць, што вынесеныя балгарскімі народнымі судамі смяротныя прыгаворы ваенным злачынцам—былым царскім саветнікам, рэгентам, міністрам і дэпутатам прыведзены ў выкананне. Гітлераўскія прыслужнікі, вінаўнікі ўцягнення Балгарыі ў вайну на баку фашысцкай Германіі, арганізатары разбойніцкіх нападаў на Югаславію і Грэцыю, атрымалі па заслугах.

* * *

Амерыканскія ўзброеныя сілы на Ціхім акіяне атрымалі новую значную перамогу. Дэсантныя войскі, якія высадзіліся на адным з важнейшых астравоў Філіпінскага архіпелага—Лусоне, зараз уступілі ў сталіцу Філіпін—горад Манілу.

**А. Валынскі**

# Вынікі адчотна-выбарчых комсамольскіх сходаў у раёне

10 лютага закончыліся адчотна-выбарчыя сходы ў пярвічных комсамольскіх арганізацыях раёна. Адчотна-выбарчыя сходы прайшлі на высокім ідэйна-палітычным узроўні. У спрэчках па адчотных дакладах сакратароў пярвічных комсамольскіх арганізацый выступіла 48 комсамольцаў. І дакладчыкі і выступаючыя адзначылі вялікую работу комсамольскіх арганізацый у справе аднаўлення разбуранай народнай гаспадаркі, у справе дапамогі фронту, шпіталям і дзецям-сіратам, бацькі якіх загінулі ў барацьбе супроць нямецкіх захопнікаў.

Аднак на раду з дадатковымі бакамі работы адчотна-выбарчыя сходы ўскрылі многа недахопаў у рабоце комсамольскіх арганізацый. Сакратары комсамольскіх арганізацый Яглевіцкай т. Асіпік, Івацэвіцкай пасялковай—т. Молаш, Івацэвіцкай чыгуначнай—т. Попка і другія дрэнна кіравалі сваімі арганізацыямі, не наладзілі цеснай сувязі з несаюзнай моладдзю, не вялі сярод яе ніякай работы. У выніку гэтыя комсамольскія арганізацыі недастаткова папаўнялі свае рады за лік лепшай несаюзнай м о л а д з і. Пры выбарах кандыдатуры старых сакратароў былі адведзены комсамольцамі са спіскаў тайнага галасавання. Сакратарамі гэтых пярвічных комсамольскіх арганізацый выбраны новыя таварышы. Комсамольцы падвергді рэзкай крытыцы ўсе недахопы і намецілі канкрэтныя мерапрыемствы для іх хутчэйшай ліквідацыі.

Зараз перад комсамольскімі арганізацыямі і новым кіруючым саставам стаіць задача—поўнасцю выканаць рашэнні адчотна-выбарчых сходаў, узмацніць дапамогу фронту, актыўна ўдзельнічаць у лесапарыхтоўках і лесавывазках, мабілізаваць усю несаюзную моладзь на тэрміновае выкананне чарговых задач.

Ф. Савін, сакратар РК ЛКСМ Беларусі

# Яглевіцкі сельсовет выканаў квартальны план лесавывазкі

Добра папрацавалі сяляне Яглевіцкага сельсовета на лесавывазках. У выніку квартальны план ужо выканан на 100 проц. Асабліва добра працавалі комсамольцы і моладзь. 4 і 10 лютага па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі былі арганізаваны васкрэснікі па вывазцы лесу, у выніку чаго было вывезена 116 кубаметраў лесаматэрыялаў. Комсамольцы паказвалі абразцы добрасумленнай працы. Так комсамолка Кузміна Валенціна, працуючы на лесавывазках, за 6 дзён вывезла 21 кубаметр драўніны.

Зараз сяляне Яглевіцкага сельсовета возяць лес звыш плана.

ПЫТЛЯК, нач. лесаўчастка.

Адказны рэдактар **А. П. Рудой.**

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага 106.